Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____ А.І.Жук
_____

Рэгістрацыйны № ТД- _____ /тып.

ГІСТОРЫЯ І ТЭОРЫЯ СУСВЕТНАЙ КУЛЬТУРЫ

Тыпавая вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях

1-21 05 01 – Беларуская філалогія
1-21 05 02 – Руская філалогія
1-21 05 04 – Славянская філалогія
1-21 05 06 – Рамана-германская філалогія

УЗГОДНЕНА

Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі
_____ У.Л. Клюня
_____

УЗГОДНЕНА

Начальнік Упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
_____ Ю.І. Міксюк
_____

Першы прарэктар Дзяржаўнай установы адукацыі
"Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"
_____ І.В. Казакова
_____

Эксперт-нормакантралёр

_____ _____
_____

Мінск 2008

Складальнікі:

Казакова Ірына Валер'еўна, першы прарэктар Дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы", доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта;

Шамякіна Таццяна Іванаўна, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

Рэцэнзенты:

1. Кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі Установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны унмверсітэт імя Францыска Скарыны";
2. СМОЛІК Аляксандр Іванавіч, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта і мастацтваў, доктар культуралогіі, прафесар

Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці Тыпавой:

Кафедрай беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 9 ад 28.05.2008 г.);

Навукова-метадычным саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 10 ад 23.06.2008 г.);

Навукова-метадычным саветам па філалагічных спецыяльнасцях Вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі (пратакол № 1 ад 16.09.2008 г.).

Адказны за выпуск: Т.І. Шамякіна

Тлумачальная запіска

Ва ўмовах сённяшняга глабальнага крызісу – экалагічнага, духоўнага, маральна-этычнага, – асаблівае значэнне набывае сістэматычнае і планамернае вывучэнне студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў гісторыі сусветнай культуры – адной з базавых дысцыплін у сістэме адукацыі. Толькі выхаванне ў атмасферы сапраўднай культуры можна лічыць па-сапраўднаму ідэалагічным – без панылай дыдактыкі і дагматызму. Выхаванне культурай – гэта ўваскрэсенне памяці духоўных вытокаў, вяртанне да светапогляднай паўнаты, да сапраўднай творчасці.

Адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі робіцца яе гуманітарызацыя, пад'ём агульнай культуры будучых спецыялістаў. Веданне гісторыі сусветнай культуры дае чалавеку магчымасць далучыцца да духоўнага вопыту старэйшых пакаленняў, стварае патэнцыяльныя магчымасці для ўсебаковага развіцця асобы і далучэння яе да агульначалавечых ідэалаў.

У аснове культуры – іерархія каштоўнасцей. Такім чынам, праз культуру можна далучаць маладых людзей да аксіялагічнага боку быцця. Важнейшую рысу культуры – яе пераемнасць – можна рэалізаваць толькі ў сістэматызаваным, лагічна пабудаваным курсе лекцый. Самастойна авалодаць усімі скарбамі сусветнай культуры, нягледзячы на ўсе сучасныя тэхналогіі, немагчыма. Акрамя таго, сёння ні адна з'ява, што мае дачыненне да філалогіі, не можа быць разгледжана без культуралагічнага кантэксту: без яго любы дыскурс ужо будзе няпоўным.

Ва ўмовах глабалізацыі вывучэнне сусветнай культуры – пры веданні сваёй, нацыянальнай – набывае асаблівае значэнне.

Праграма разлічана на студэнтаў філалагічных факультэтаў і улічвае папярэдне атрыманыя веды па гісторыі сусветнай літаратуры, веданне ў цэлым культурных эпох і некаторыя папярэднія звесткі па розных відах мастацтва.

У Праграме прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей па гісторыі культуры і гісторыі нацыянальнай, рускай і сусветнай літаратуры, гісторыі Беларусі, міфалогіі, фалькларыстыкі і некаторых іншых дысцыілан.

Праграма арыентавана на пошук гібкіх сувязей паміж культурна-гістарычнымі і ўласна філалагічнымі праблемамі. Прычым мастацкая літіратура паказана тут яе індыкатар стану культуры. Асаблівае значэнне нададзена ўсіходнім цывілізацыям, бо Кітай і Індыя выходзяць сёння ў лідэры сусветнага развіцця. У гэтым – наватарства Праграмы і яе адрозненне ад іншых праграм падобнага тыпу (у прыватнасці, па культуралогіі). Праграма ў цэлым пабудавана нетрадыцыйна, арыгінальна, з улікам навейшых дасягненняў у навуцы. Праграма сістэматызуе вялікі тэарэтыка-практычны матэрыял, неабходны менавіта студэнтам-філолагам для лепшага засваення імі асноўных дысцыплін спецыялізацыі.

Мэта дысцыпліны: раскрыццё сутнасці культуры і заканамернасцей яе гістарычнага развіцця, асэнсаванне унікальнага вопыту дыялога культур, што асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі. Фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў культуры, што асноўваецца на разуменні навуковай карціны свету.

Задачы дысцыпліны:
- паказаць значэнне канцэпцыі культуры ў цэлым і яе асноўных структурных элементаў у дынаміцы развіцця;
- асэнсаваць асаблівасці розных тыпаў культуры, перспектыў духоўнага развіцця чалавецтва;
- вывучыць гісторыю сусветнай культуры як сістэмы, як цэласнасці;
- паказаць значэнне філасофіі, мастацтва, рэлігіі, навукі як унікальных каштоўнасцей чалавецтва;

Пры вывучэнні дысцыпліны "Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры" студэнты павінны:
ведаць:
- асноўныя этапы развіцця культуры ў сувязі з гісторыяй чалавецтва;
- адрозненне культуры і цывілізацыі, характэрныя асаблівасці розных цывілізацыйных тыпаў, у тым ліку, сучаснай чалавечай цывілізацыі;
- асноўныя культурныя дасягненні пэўных геаграфічных рэгіёнаў і народаў;
- асноўныя шэдэўры мастацтва, створаныя геніямі чалавецтва;
- крытэрыі мастацкай ацэнкі твораў мастацтва;
умець:
- бачыць сувязь развіцця мастацтва з рэлігійнымі, філасофскімі пошукамі, дасягненнямі навукі і адукацыі;
- бачыць значэнне мастацкай літаратуры як індыкатару стану культуры;
- аналізаваць творы сусветнага мастацтва з эстэтычнага пункту гледжання;
- характарызаваць творы класічнай і масавай культуры.

Метады навучання:

1. Вуснае выкладанне ведаў выкладчыкам і актыўная пазнавальная дзейнасць студэнтаў (лекцыя, расказ, тлумачэнне, ілстрацыя, дэманстрацыя).
2. Замацаванне вывучаемага матэрыялу.
3. Самастойная праца студэнтаў па асэнсаванні і замацаванні вывучаемага матэрыялу (праца з арыгінальнымі мастацкімі рэлігійнымі тэкстамі, альбомамі з рэпрадукцыямі, выкананне дамашніх заданняў).
4. Вучэбная праца па выкарыстанні ведаў на практыцы і выпрацоўцы ўменняў і навыкаў (практыкаванні, працаз альбомамі, тэкстамі).

5. Праверка і ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў (індывідуальнае, франтальнае апытванне, кантрольныя работы, праверка рэфератаў, праграмаваны кантроль).

Максімальная колькасць гадзін на дысцыпліну – 100.
Колькасць аўдыторных гадзін – 34.
З іх:
Лекцыі – 24.
Практычныя заняткі – 10.

ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ДЫСЦЫПЛІНЫ “ГІСТОРЫЯ І ТЭОРЫЯ СУСВЕТНАЙ КУЛЬТУРЫ”

Нумар раздзела, тэмы заняткаў	Назва раздзела, тэмы, заняткаў	Колькасць аўдыторных гадзін		**Усяго**
		Лекцыі	Практычныя заняткі	
	РАЗДЗЕЛ І. ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ	**4**		**4**
1.1	Культура як з’ява грамадства і аб’ект вывучэння навукі. Ступені эвалюцыі сусветнай культуры. Школы, напрамкі, канцэпцыі ў гісторыі вывучэння культуры	2		2
1.2	Культура палеаліту і неаліту	2		2
	РАЗДЗЕЛ ІІ. КУЛЬТУРА УСХОДНІХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ	**12**		**12**
2.1	Культура Егіпта	2		2
2.2	Культура Месапатаміі	2		2
2.3	Культура Ірана (Персіі)	2		2
2.4	Культура Кітая	2		2
2.5	Культура Індыі	2		2
2.6	Культура Японіі	2		2
	РАЗДЕЛ ІІІ. КУЛЬТУРА ЗАХОДНЯЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ	**4**	**6**	**10**
3.1	Культура Антычнасці	2		2
3.2	Старажытная Палесціна і ўзнікненне хрысціянтва		2	2
3.3	Культура Сярэднявечча		2	2
3.4	Культура эпохі Адраджэння		2	2
3.5	Культура Захаду Новага часу	2		2
	РАЗДЕЛ IV. БЕЛАРУСКАЯ, СЛАВЯНСКАЯ, РУСКАЯ КУЛЬТУРА		**4**	**4**
4.1	Беларуская культура		2	4
4.2	Руская і славянская культура		2	4
	РАЗДЕЛ V. КУЛЬТУРА XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯЎ	**4**		**4**
5.1	Савецкая і постсавецкая культура	2		4
5.2	Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры XX – пачатку XXI стст.	2		4
Усяго:		**24**	**10**	**34**

ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

РАЗДЗЕЛ І.
ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ

1.1. Культура як з'ява грамадства і аб'ект вывучэння навукі. Ступені эвалюцыі сусветнай культуры. Школы, напрамкі, канцэпцыі ў гісторыі вывучэння культуры

Паняцце культуры. Асноўныя падыходы да вызначэння культуры ў сучаснай навуцы. Этнічная культура. Культура сацыяльных і тэрытарыяльных груп. Прадмет і задачы курса "Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры".

Прырода і культура. Функцыі культуры. Этапы ў развіцці сусветнай культуры. Культура і цывілізацыя.

Разнастайнасць падыходаў і напрамкаў. Культуралагічная тэорыя І. Данілеўскага і К. Леонцьева. Канцэпцыя лакальных культур О. Шпэнглера і А. Тойнбі. Гісторыясофская тэорыя К. Ясперса. Тэорыя суперсістэм П. Сарокіна. Культурна-гістарычная канцэпцыя еўразійцаў. Этнагенетычная тэорыя Л. Гумілёва.

1.2. Культура палеаліту і неаліту

Антропагенезіс. Станаўленне першабытанай культуры. Архаічны (даміфалагічны) светапогляд. Татэмізм як адна з найбольш старажытных форм вераванняў (эпохі палеаліту). Анімізм як тып светаадчування дагістарычнай эпохі. Міфалогія і яе значэнне. Рытуал і яго функцыі ў першабытным грамадстве. Выяўленчае мастацтва эпохі палеаліту. Дасягненні неалітычнай рэвалюцыі. Курганна-мегалітычная культуры V–I тыс. да н.э. у Еўразіі. Цывілізацыя Чатал-Гуюка. Праблема прарадзімы індаеўрапейцаў.

РАЗДЗЕЛ ІІ.
КУЛЬТУРА УСХОДНІХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ

2.1. Культура Егіпта

Агульная характарыстыка. Геаграфічнае палажэнне. Этнагенезіс. Міфалагічная гісторыя. Асноўныя этапы рэальнай гісторыі. Вывучэнне Старажытнага Егіпта.

Асаблівасці светаадчування старажытных егіпцян. Паўсядзённае жыццё старажытных егіпцян. Эстэтычныя ўяўленні старажытных егіпцян. Навуковая думка ў Старажытным Егіпце.

Культура эпохі Старажытнага Царства. Рэлігійныя вераванні. Пантэон. Уяўленні пра душу. Піраміды.

Культура эпохі Сярэдняга Царства. Роспісы пахавальняў. Асноўныя выяўленчыя каноны. Шэдэўры скульптуры. Літаратура Старажытнага Егіпта.

Культура эпохі Новага Царства. Эпоха царыцы Хатшэпсут. Рэлігійная рэформа фараона Эхнатона. Мастацтва эпохі Эхнатона. Пахавальня Тутанхамона – дасягненні ў дэкаратыўным мастацтве. Храмы і скульптуры эпохі Рамсесаў: Луксор, Карнак. Значэнне культуры Старажытнага Егіпта ў гісторыі чалавечай цывілізацыі.

Егіпет эпохі элінізму. Характарыстыка эпохі. Александрыя як культурны цэнтр. Александрыйская філалагічная школа. Александрыйскі маяк – адно з цудаў свету.

Сярэднявечны Егіпет. Хрысціянства ў Егіпце. Коптская царква. Помнікі іслама ў Каіры. Археалагічныя адкрыцці XIX стагоддзя.

Сучасны Егіпет. Гісторыя Егіпта ў XX стагоддзі. Асноўныя турыстысныя аб'екты на тэрыторыі Егіпта.

2.2. Культура Месапатаміі

Шумерская цывілізацыя. Міфалогія шумераў. Асноўныя дасягненні ў навуцы і тэхналогіях. "Эпас пра Гільгамеша" – першы літаратурны твор чалавецтва. Архітэктура шумераў (зікураты).

Вавілонскае царства. Дасягненні ў будаўніцтве дзяржавы, права. Літаратурныя творы. Развіццё навукі. Вавілон – шэдэўр горадабудаўніцтва.

Асірыя. Арганізацыя войска. Сталіца дзяржавы – горад Ніневія. Роспісы і барэльефы. Бабліятэка цара Ашурбаніпала. Асірыйскі этнас у гісторыі.

Арабскі халіфат. Культура класічнага арабкага Усходу. Ірак. Фарміраванне ісламскай цывілізацыі. Сунізм і шыізм, суфізм. Заваяванні арабаў. Багдад. Свяшчэнныя гарады Ірака – Нэджэф і Кербела. Казкі "1001 ночы". Дасягненні арабскай навукі, філасофіі, мастацтва. Сучасны лёс Ірака.

2.3. Культура Ірана (Персіі)

Культура Старажытнага Ірана ў святле археалагічных доследаў. Арыяна. Авеста. Авеста – найбольш старажытная свяшчэнная кніга чалавецтва. Асаблівасці рэлігіі зараастрызму.

Культура Персіі імперскага перыяду. Фарміраванне імперыі Кіра. Шэдэўр горадабудаўніцтва – сталіца Персіі горад Персепаль.

Сярэднявечная Персія і сучасны Іран. Культавая архітэктура Сярэдняй Азіі (Бухара, Самарканд, Хіва). Дэкаратыўнае мастацтва Персіі (дываны, тканіны, чаканка). Класічная літаратура Персіі: Рудакі, Фердоусі, Амар Хаям, Саадзі, Хафіз. Гістарычныя і культурныя цэнтры Персіі: Шыраз, Ісфаган, Тэгеран. Сучасны Іран і яго стасункі з Беларуссю.

2.4. Культура Індыі

Агульная характарыстыка. Прырода і культура Індыі. Паходжанне шмат якіх культурных раслін з Індыі. Этналінгвістычнае багацце краіны. Індыйская кулінарыя, паўсядзённае жыццё індусаў.

Індская і арыйская цывілізацыі. Харапская (Індская) цывілізацыя на тэрыторыі Індыі і Пакістана. Горад Махенджа-даро – самы вялікі з раскапаных гістарычных гарадоў свету. Арыі ў Індыі. Сістэма кастаў. Веды-рэлігійны помнік арыйцаў. “Махабхарата” і “Рамаяна” – шэдэўры літаратуры сусветнага значэння.

Рэлігіі Індыі і звязанае з імі мастацтва. Буддызм. Гісторыя жыцця царэвіча Гаутамы. Культура эпохі імператара Ашокі. Індуізм. Пячорныя гарады і храмавыя комплексы – Аджанта, Элора. Храмавы комплекс Каджураха ў Арысе.

Сярэднявечная і сучасная Індыя. Мусульманскі перыяд у гісторыі Індыі. Імперыя Маголаў. Шэдэўр архітэктуры – Тадж Махал. Каланіяльны перыяд у гісторыі Індыі. Перыяд індыйскага адраджэння (Рабіндранат Тагор). Барацьба за незалежнасць. Філасофскія традыцыі індыйскай культуры і навуковыя веды. Сучаснае імклівае развіццё Індыі. Уклад Індыі ў сусветную культуру.

2.5. Культура Кітая

Агульныя звесткі. Геаграфічнае палажэнне. Асновы светаразумення. Міфалогія. Кітайскі каляндар. Пісьменнасць. Унікальнасць кітайскай культуры. Рытуал і этыка ў традыцыйным Кітаі.

Перыяд Архаікі. Эпоха Ся. Эпоха Шан – росквіт бронзы. Эпоха Чжоў – “сто школ” у філасофіі Кітая. Дзейнасць Конфуция. Даасізм.

Перыяд Класікі. Утварэнне імперыі Цынь. Вялікая кітайская сцяна. Пахавальня Цынь-Шыхуандзі. Імперыя Хань – залаты век імперыі. Росквіт навукі, тэхнікі, мастацтва. Вялікі шоўкавы шлях. Дасягненні кітайскай медыцыны.

Эпоха Шасці дынастый. Рост уплыву буддызму. Кітайска-буддысцкае храмавае дойлідства.

Эпохі Тан и Сун. Культурна-ідэалагічныя працэсы ў Кітаі ў VII-XII стст. Класічная паэзія эпохі Тан. Жыццё і творчасць класікаў кітайскай літаратуры Лі Бо і Ду Фу. Жывапіс Кітая эпохі Сун – асноўныя матывы, стылі, тэхнікі..

Эпоха Мін. Асаблівасці кітайскай архітэктуры. Планіроўка Пекіна, збудаванні Забароненага горада. Росквіт мастацкай літаратуры – зборнікі навел і класічныя раманы. Дэкаратыўнае мастацтва Кітая. Уплыў мастацтва Кітая на еўрапейскую культуру. Кітайская кухня.

Кітай ў XIX-XXI вв. Стварэнне рэалістычных твораў. Творчасць Лу Сіня. Барацьба з Японіяй. Стварэнне КНР. Цяжкасці росту. Кітай апошняга дваццацігоддзя – мудрае правядзенне рэформ. Кітай – супердзяржава. XXI стагоддзя. Кітайская сям’я: традыцыі і сучасныя тэндэнцыі. Кітайская культура і Захад.

2.6. Культура Японіі

Агульныя звесткі. Прыродныя ўмовы. Культура неаліту – Дзёмон. Міфалогія аўтахтоннага насельніцтва – айнаў.

Гістарычныя гарады Японіі. Нара – першая сталіца Японіі: першы драўляны храм, каласальная скульптура Будды. Кіёта – горад арыстакратычнай культуры: планіроўка, палацы імператара і сёгуна, асноўныя храмы, незвычайныя сады – імхоў, камянёў і інш. Жанчыны-пісьменніцы – класікі японскай літаратуры эпохі Сярэднявечча – Мірасакі Сікібу і Сей-Сёнагон. Эпоха дынастыі сёгунаў Такугава. Токіа – сталіца Японіі пасля буржуазнай рэвалюцыі 1968 года. Японія ў Другой сусветнай вайне. Гарады Хірасіма і Нагасакі.

Традыцыйная культура Японіі. Рэлігіі буддызм і сінтаізм. Культ гары Фудзіямы. Жанчыны і дзеці Японіі. Класічны тэатр Кабукі. Класікі жывапісу – Хірасіга і Хокусаі. Традыцыйны японскі сад. Рытуал таною. Традыцыйныя мастацтвы – ікебана і бансай. Японскія народныя святы. Культура Японіі ў коле азіяцкіх культур. Культура Японіі і сучаснасць.

РАЗДЗЕЛ III.
КУЛЬТУРА ЗАХОДНЯЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

3.1. Культура Антычнасці

Крыта-мікенскі перыяд. Перасоўванні індаеўрапейскіх плямёнаў ў III-II тыс.да н.э. па Еўропе і Міжземнамор'ю. Фарміраванне грэчаскай міфалогіі. Мінойская культура вострава Крыт. Сімволіка Лабірынта. Кноскі палац. Мікены – горад сямейных драм эпохі Антычнасці. Пагібель Троі – важнейшая падзея архаічнай гісторыі.

Антычная Грэцыя перыяду Архаікі. Адраджэнне Грэцыі пасля "цёмных стагоддзяў". Полісная сістэма дзяржаўнасці. Алімпійскія гульні. Міфалогія Антычнай Грэцыі: пантэон, асноўныя цыклы міфаў. Элінскій эпас. Грэчаская лірыка. Натурфілосафы эпохі Архаікі. Грэчаскі архітэктурны ордэр. Скульптура. Дэкаратыўнае мастацтва.

Антычная Грэцыя перыяду Класікі. Палітычная культура старажытных грэкаў. Класічны перыяд у гісторыі філасофія. Афіны – цэнтр адукацыі і культуры. Акадэмія Платона і Ліцэй Арыстоцеля. Антычныя каляндарныя містэрыі і мастацтва драмы. Афінскі Акропаль – шэдэўр антычнай архітэктуры. Алімпія. Скульптары эпохі Класікі. Сямейныя адносіны і быт грэкаў.

Культура Анычнага Рыма. Асноўныя гістарычныя падзеі і культурныя дасягненні. Рымская міфалогія. Пунічныя войны і грамадзянская вайна I ст. да н.э. Дзейнасць Юлія Цэзара. Юліянскі каляндар. "Залаты век" імператара Аўгуста. Тэатр і святы. Рымскі раман. Скульптурны партрэт. Уплыў культуры Рыма на станаўленне Заходняй цывілізацыі. Права і дзяржаўныя інстытуты. Навука і адукацыя. Рымскія гісторыкі. Асноўныя архітэктурныя формы, тыпы будынкаў. Рымскае дойлідства, Пампеі, Баальбек. Побыт.

Культура элінізму. Паходы Аляксандра Македонскага. Сінтэз мастацтва Захада і Усхода. Інтэнсіўнасць развіцця мастацтва. Асноўныя дасягненні эпохі. Цуды свету. Скульптура.

3.2. Старажытная Палесціна і ўзнікненне хрысціянства

Гісторыя яўрэйскага народа. Іудаізм. Геаграфічнае, сакральнае палажэнне Палесціны, флора і фаўна. Архаічная гісторая. Патрыярхі яўзрэйскага народа. Стварэнне дзяржавы Ізраіль паводле Бібліі. Дзейнасць першых цароў. Іерусалімскі храм. Вавілонскі палон. Перыяд Другога храма.

Біблія, яе значэнне. Структура Бібліі. Асноўныя кнігі Старога Запавету.

Хрысціянства. Сацыяльна-палітычнае палажэнне Іудзеі як правінцыі Рыма ў I ст. да н.э., I ст. н.э. Іаан Хрысціыель. Жыццё Хрыста. Новы Запавет. Асновы хрысціянскай рэлігіі. Фарміраванне і станаўленне хрысціянскай царквы.

3.3. Культура Сярэднявечча

Ранняе Сярэднявечча. Перыядызацыя. Сацыяльна-палітычная абстаноўка ў Еўразіі. Вялікае перасяленне народаў. Станаўленне сістэмы сусветных рэлігій. Іслам. Арабскі халіфат.

Этапы станаўлення "другога Рыма". Канстанцінопаль – горад на двух кантынентах. Святая Сафія. Візантыйскі архітэктурны стыль – шэдэўры дойлідства ў розных краінах. Літаратура Візантыі. Тэалогія. Візантыя і славянскі свет.

Позняе Сярэднявечча: Чаша Грааля як містычны сімвал Сярэднявечча і звязаная з ім літаратура. Паходы крыжакоў. Рэкансіста ў Іспаніі. Адкрыццё Амерыкі.

Асноўныя архітэктурныя стылі Сярэднявечча: візантыйскі, маўрытанскі, раманскі, гатычны.

Ментальныя асновы і характэрныя рысы заходнееўрапейскай сярэднявечнай культуры.

Еўразійская культура: культурныя дасягненні народаў Каўказа і Сярэдняй Азіі. Стварэнне дзяржавы Чынгісхана, Асманскай імперыі.

Культура Мезаамерык: цывілізацыя альмекаў, тальцекаў, майя, інкаў.

3.4. Культура эпохі Адраджэння

Агульная характарыстыка эпохі: Прырода і культура. Вялікія геаграфічныя адкрыцці. Рэфармацыя. Архітэктурны стыль рэнесанс. Асноўныя дасягненні ў галіне навукі і тэхнікі.

Культура Італіі. Гарады Італіі ў эпоху Адраджэння: Фларэнцыя, Венецыя, Мілан, Рым. Жывапіс. Італьянскія жывапісныя школы. Аналіз творчасці Леанарда да Вінчы, Мікельанджала, Тыцыяна, Бацічэлі, Рафаэля.

Паўночнае Адраджэнне: Творчасць Альбрэхта Дзюрэра, Іераніма Босха, Пітэра-Брэйгеля, іх актуалізацыя ў мастацтве XX ст.

Адраджэнне ў краінах Еўропы: Францыя: літаратура, архітэктура, Англія: літаратура, архітэктура, тэатр. Іспанія: літаратура, тэатр, архітэктура. Рэнесанс у славянскіх краінах.

3.5. Культура Захаду Новага часу

Еўрапейская культура XVII ст. Пераходны характар культуры – ад Сярэднявечча да Новага часу. Класіцызм. Барока як стыль эпохі. Фламандская школа жывапісу.

Эпоха Асветы: Філасофія Новага часу. Секулярызацыя. Асноўныя мастацкія напрамкі. Культура ракако. Мастацтва Францыі, Англіі, Іспаніі, Германіі. Венская школа ў музыцы.

Культура Захаду ў XIX ст.: Агульная характарыстыка эпохі. Дасягненні ў навуцы і тэхніцы. Эпоха рамантызму. Стагоддзе літаратуры, музыкі, тэатра. Стыль ампір. Новыя напрамкі ў архітэктуры.

Культура мяжы стагоддзяў. Філасофія Новага часу. Новыя тэндэнцыі ў мастацтве. Стыль мадэрн.

Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры XX – пачатку XXI стст.: Асноўныя сацыяльна-палатычныя падзеі стагоддзя. Навукова-тэхнічны прагрэс і гуманітарная культура. Пошукі рэалістычнага мастацтва. Напрамкі мадэрнізму. Стылі ў архітэктуры. Развіццё кіно. Эстэтыка постмадэрнізму.

РАЗДЗЕЛ IV.
БЕЛАРУСКАЯ, СЛАВЯНСКАЯ, РУСКАЯ КУЛЬТУРА

4.1. Беларуская культура.

Фальклор – аснова беларускай культуры. Імёны і святыні. Фарміраванне беларускай народнасці. ВКЛ. Гісторыя Вільні. Рост гарадоў. Летапісанне. Рэлігійна-царкоўная барацьба. Архітэктура і тэатр на Беларусі. Рамёслы. Быт. Заняпад культуры ў XVII – XVIII стст. Культура Беларусі XIX – пачатку XX стст. Культурнае развіццё Беларусі ў савецкі і постсавецкі перыяды.

4.2. Руская і славянская культура

Розныя тэорыі ўзнікнення Рускай дзяржаўнасці. Хрышчэнне Русі. Першыя рускія святыя. Культура Кіеўскага княства, Уладзіміра-Суздальскага, Наўгародскага. Полацкае і Тураўскае княствы. Татара-мангольскае нашэсце і лёс усходніх славян. Масква ў розныя гістарычныя перыяды. Школа іканапісу. Святы Андрэй Рублёў. Канцэпцыя “Масква – Трэці Рым”. Крэмль. Ад Русі да Расіі. Дойлідства XVI ст. – фарміраванне “рускага стыля”. Дзейнасць Сімяона Полацкага яг ўплыў на культуру Масковіі. Царкоўны раскол. Рэформы Пятра I ў галіне культуры. Класіцызм і барока ў мастацтве. Горад Пецярбург – галоўнае дасягненне эпохі. Агульная характарыстыка сацыяльна-палітычнага становішча Расіі ў XIX ст. Беларусь у складзе Расіі. Навука і адукацыя. Дзейнасць заходнікаў і славянафілаў. Росквіт архітэктуры. Уплыў літаратуры на тэатр і іншыя віды мастацтва. Рамантызм у жывапісе. Творчасць перасоўнікаў. Развіццё музыкі: асноўныя дасягненні. Мастацкія напрамкі ў культуры Сярэбранага веку (пачатак XX ст.). Дасягненні рускай навукі.

Славянскі свет. Праблема этнагенезу славянскіх народаў. Культура старажытных славян. Міфалогія і рытуалы. Дзяржавы на тэрыторыі славян, іх культура (Вялікая Маравія, Балгарскае царства. Сербія, Чэхія і інш.

РАЗДЗЕЛ V.
КУЛЬТУРА XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯЎ

5.1. Савецкая і постсавецкая культура

Напрамкі ў літаратуры і мастацтве савецкага часу**.** Шэдэўры архітэктуры (на прыкладзе Масквы, Мінска). Савецкая музыка, жывапіс, кіно, тэатр.

Развіццё культуры постсавецкіх рэспублік. Архітэктура і дэкаратыўнае мастацтва эклектычнага характару. Філасофія і мастацтва постмадэрнізму. Лёс культуры ў тэхнагеннай прасторы, у спажывецкім грамадстве.

5.2. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры XX – пачатку XXI стст.

Асноўныя сацыяльна-палатычныя падзеі стагоддзя. Навукова-тэхнічны прагрэс і гуманітарная культура. Пошукі рэалістычнага мастацтва. Напрамкі мадэрнізму. Стылі ў архітэктуры. Развіццё кіно. Эстэтыка постмадэрнізму.

Элітарная, масавая, маргінальная культура, субкультура, контркультура. Касмізацыя і экалагізацыя культуры. Дыялог культур Усходу і Захаду. Альтэрнатыўныя шляхі развіцця сусветнай цывілізацыі.

ЛІТАРАТУРА

Асноўная:

1. Актуальные проблемы культуры XX века / Под ред.В.И.Добрынина. М., 1993.
2. Алексеев В.П., Першиц А.И. История первобытного общества. М., 1979.
3. Алексеева В.В. Что такое искусство? М., 1991.
4. Алпатов М. Этюды по всеобщей истории искусств. М., 1979.
5. Аронов В.Р. Художники и предметное творчество: Проблемы взаимодействия материальной и художественной культуры XX века. М., 1987.
6. Артановский С.Н. Историческое единство человечества и взаимное влияние культур. Л., 1967.
7. Артановский С.Н. На перекрестке идей и цивилизаций. Спб., 1994.
8. Арутюнов С.А. Народ и культуры: развитие и взаимодействие. М., 1986.
9. Бабушкин С.А. Теория цивилизации. Курск, 1997.
10. Базен Ж. История истории искусств: От Вазари до наших дней. М., 1994.
11. Банфи А. Философия искусства. М., 1989.
12. Бартенев И.А., Батажкова В.Н. Очерки истории архитектурных стилей. М., 1983.
13. Бердяев Н.А. Философия творчества, культуры и искусства: В 2 т. М., 1994.
14. Библер В.Г. На грани логики культуры. М., 1991.
15. Боголюбов Е.В. Культура и общество (вопросы истории и теории). М., 1978.
16. Быстрова А.Н., Киселев В.А. Мир культуры и культура мира. Новосибирск, 1996.
17. Воинов А.А. История архитектуры Белоруссии. Т.1-2. Мн., 1987.
18. Волков И.Ф. Творческие методы и художественные системы. М., 1989.
19. Всеобщая история искусств: В 6 т. М., 1960-1966.
20. Герцук Ю. Русское искусство с древних времен до начала XX века. М., 1979.
21. Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Мн., 1994.
22. Гнедич П.П. Всемирная история искусств. М., 1996.
23. Гомбрил Э. История искусства. М., 1998.
24. Дмитриева Н.А. Краткая история искусств. Очерки. Вып.1-3. М., 1969, 1991, 1993.
25. Драч Г.В. Культурология. Ростов-на-Дону, 1997.
26. Ильина Т.В. История искусства. Западноевропейское искусство. М., 1983.
27. Импрессионисты, их современники, их соратники. М., 1976.
28. Искусство стран и народов мира: В 5 т. М., 1962-1991 (Краткая художественная энциклопедия).
29. История религии. СПб., 1997.
30. История русского искусства: В 3 т. М., 1994.

31.Левяш И.Я. Культурология. Учебное пособие для студентов вузов. Мн., 2000.
32.Лисичкина О.Б. Мировая художественная культура. СПб., 1997.
33.Лосев А.Ф. История античной эстетики. В 7 т. М., 1963-1988.
34.Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996.
35.Мартынов В.Ф. Мировая художественная культура. Мн., 2000.
36.Массовая культура и советское изобразительное искусство. М., 1988.
37.Мифологический словарь. М., 2002.
38.Мифы народов мира: Энциклопедия. В 2 т. М., 1991.
39.Мифы в искусстве старом и новом. М., 1992.
40.Наливайко Д.С. Искусство: Направления, течения, стили. Киев, 1981.
41.Популярная художественная энциклопедии. Т.1-2. Изд.2-е, доп., 2001.
42.Радугина А.А. Культурология. М., 1997.
43.Сарабьянов Д.В. История русского искусства конца XIX – начала XX в. М., 1993.
44.Современное западное искусство. XX век: Проблемы комплексного изучения. М., 1988.
45.Соколов Э.В. Культурология: Очерки теории культуры. М., 1994.
46.Средства массовой коммуникации и современная художественная культура. М., 2003.
47.Станькова Я., Пехар И. Тысячелетнее развитие архитектуры. М., 1987.
48.Философия культуры. Становление и развитие. Сб. СПб., 1998.
49.Философия русского религиозного искусства XVI-XX вв.: Антология. М., 1983.
50.Чернокозов А.И. История мировой культуры. Ростов-на-Дону, 1997.
51.Шейнина Е.Я. Энциклопедия символов. М., 2002.
52.Энциклопедия живописи. М., 1997.
53.Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Мн., 1984-1987.
54.Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.
55.Энцыклапедыя Беларусі. У 18 т. Тт.1-17. Мн., 1995-2000.
56.Юренев Р. Чудесное кино: Краткая история мирового кино. М., 1985.
57.Яковец Ю.В. История цивилизаций. М., 1997.

Дадатковая:

1. Абдеев Р.Ф. Философия информационной цивилизации. М., 1994.
2. Авдеев А.Д. Происхождение театра. М., 1959.
3. Алексеев В.М. Китайская культура. М., 1978.
4. Алексеев В.П. Становление человечества. М., 1084.
5. Альбедиль М.Ф. Протоиндийская цивилизация. Очерки культуры. М., 1994.
6. Античная культура и современная наука. М., 1985.
7. Античная цивилизация. М., 1973.
8. Античность и Византия. М., 1975.
9. Арган Дж. История итальянского искусства. В 2-х т. М., 1990.

10. Афанасьева В.К. и др. Искусство Древнего Востока. М., 1976.
11. Бадик А.М. История Древнего мира. Мн., 1998.
12. Банк А.В. Культура и искусство Византии IV-XV вв. М., 1957.
13. Барокко в славянских культурах. М., 1985.
14. Баткин Л.В. Итальянские гуманисты: Стиль жизни, стиль мышления. М., 1978.
15. Баткин Л.В. Итальянское Возрождение в поисках индивидуальности. М., 1989.
16. Батракова С.П. Искусство и утопия: Из истории западной живописи и архитектуры XX века. М., 1990.
17. Бенеш О. Искусство Северного Возрождения. М., 1973.
18. Бицилли П.М. Место Ренессанса в истории культуры. СПб., 1996.
19. Богословский Е.С. Повседневная жизнь в Древнем Египте. М., 1994.
20. Бонгард-Левин Г.М. Древнеиндийская цивилизация: Философия, наука и религия. М., 1980.
21. Боннар А. Греческая цивилизация. М., 1992.
22. Борисковский П.И. Древнейшее прошлое человечества. М., 1990.
23. Борьба тенденций в современном западном искусстве. М., 1986.
24. Брагина Л.М. Итальянский гуманизм. М., 1977.
25. Брайтон П. Путешествие в сакральный Египет. М., 1997.
26. Буддизм и культурно-психологические традиции народов Востока. Новосибирск. 1990.
27. Буддизм. История и культура. СПб. М., 1989.
28. Буддийский взгляд на мир. СПб., 1994.
29. Быт и история в античности. М., 1988.
30. Бычков В.В. Малая история византийской эстетики. Киев, 1991.
31. Бычков В.В. Эстетика поздней античности. М., 1981.
32. Васильев Л.С. История религии Востока. М., 1988.
33. Винничук Л. Люди, нравы и обычаи Древней Греции и Рима. М., 1988.
34. Виноградова Н.А., Николаева Н.С. Искусство стран Дальнего Востока. М., 1979.
35. Виппер Б.Р. Итальянский Ренессанс. В 2 т. М., 1977.
36. Гачев Г. Образы Индии. М., 1993.
37. Генон Р. Кризис современного мира. М., 1991.
38. Грейвс Р. Мифы Древней Греции. М., 1992.
39. Григорьева Т.П. Дао и логос (встреча культур). М., 1992.
40. Григорьева Т.П. Красотой Японии рожденный. М., 1993.
41. Григорьева Т.П. Японская художественная традиция. М., 1979.
42. Гулыга А.Б. Искусство в век науки. М., 1978.
43. Гуревич А.Я. Средневековый мир: культура безмолвного большинства. М., 1990.
44. Гусева Н.Р. Индуизм. М., 1977.
45. Добиаш-Рождественская О.А. Культура западноевропейского средневековья. М., 1987.
46. Долгополов И.В. Мастера: Новеллы о художниках. М., 1981.

47. Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Беларуси. Мн., 1992.
48. Жорж Дюби. Европа в средние века. Смоленск, 1994.
49. Западноевропейская художественная культура XVIII века. М., 1980.
50. Зеленинова М.Е. Советское киноискусство: Библиографический указатель. М., 1980.
51. Зотов А.М. Русское искусство с древнейших времен до начала XX века. М., 1989.
52. Иди М. Доисторический человек. Л., 1991.
53. Из истории русского искусства второй половины XIX – начала XX века. М., 1978.
54. Иконников А.В. Современная архитектура. М., 1983.
55. Индия в средние века. М., 1970.
56. Иоанн (Экономцев), игумен. Православие. Византия. Россия. М., 1992.
57. История Византии: В 3 т. // Отв.ред. С.Д.Сказкин. М., 1967.
58. История и культура древнерусского города. М., 1989.
59. Иэнага Сайкаку. История японской культуры. М., 1972.
60. Кантор А.И. Изобразительное искусство XX века. М., 1988.
61. Каптерева Т.П., Виноградова Н.А. Искусство средневекового Востока. М., 1989.
62. Кацельнесон М. Иерусалим – город трех религий. Спб., 1998.
63. Кертман Л.Е. История культуры стран Европы и Америки. М., 1988.
64. Классическое и современное искусство Запада: Мастера и проблемы. М., 1989.
65. Клочков И.С. Духовная культура Вавилона: Человек, судьба, время. М., 1983.
66. Кнабе Г.С. Древний Рим – история и повседневность. М., 1986.
67. Кокс Р. Семь чудес света. М., 1997.
68. Конрад Н.И. Запад и Восток. М., 1976.
69. Культура Древнего Рима. В 2 т. М, 1986.
70. Левек П. Эллинистический мир. М., 1989.
71. Леви-Стросс К. Первобытное мышление. М., 1995.
72. Ле Гроф Ж. Цивилизация средневекового Запада. М., 1992.
73. Лосев А.Ф. Эстетика Возрождения. М., 1978.
74. Лотман Ю.М. Русская культура XIX в. М., 1998.
75. Любимов Л.И. Искусство Древнего мира. М., 1998.
76. Майхрович А.С. Поиск истинного бытия человека: из истории философии и культуры Беларуси. Мн., 1992.
77. Малявин В.В. Традиционная эстетика в странах Дальнего Востока. М., 1987.
78. Масон М.Э. Первые цивилизации. Л., 1989.
79. Машковцев Н.Г. Из истории русской художественной культуры. М., 1982.
80. Мейсон Э. Древние цивилизации. М., 1997.
81. Мелетинский Е.М. Поэтика мифа. М., 1995.

82. Мелларт Дж. Древнейшие цивилизации Ближнего Востока. М., 1982.
83. Менар Р. Мифы в искусстве старом и новом. М., 1992.
84. Мень А.В. Культура и духовное возрождение. М., 1992.
85. Муратов П.П. Образы Италии. М., 1994.
86. Мыльников А.С. Основы исторической типологии культуры. Л., 1979.
87. Немировский А.И. Мифы Древней Эллады. М., 1992.
88. Немировский А.И. Мифы и легенды Древнего Востока. М., 1994.
89. Пилкингтон С.М. Иудаизм. М., 1998.
90. Пиотровский М.Б. Коранические сказания. М., 1991.
91. Полевой В.М. Искусство Греции: Древний мир. Средние века. Новое время. М., 1984.
92. Реализм и художественные искания XX века. М., 1989.
93. Рудаков Александр, протоирей. Краткая история христ ианской церкви. М., 2000.
94. Русская художественная культура второй половины XIX века. М., 1983.
95. Рыбаков Б.А. Язычество Древней Руси. М., 2002.
96. Стерлин Г.Д. Художественная жизнь России середины XIX века. М., 1991.
97. Струве В.В. Культура Древнего Египта. М., 1975.
98. Тайлер Э.Б. Первобытная культура. М., 1989.
99. Типология стилевого развития нового времени. М., 1976.
100. Токарев С.А. Ранние формы религии. М., 1990.
101. Тюляев С.И. Искусство Индии: архитектура, изобразительное искусство, художественные ремесла. М., 1981.
102. Федорова Е.В. Люди императорского Рима. М., 1990.
103. Феодорит, епископ Кирский. Церковная история. М., 1993.
104. Фицджеральсд .П. Китай: Краткая история культуры. СПб., 1998.
105. Фрилинг Р. Христианство и ислам. М., 1997.
106. Хачутурян В.М. История мировых цивилизаций. М., 1998.
107. Хейзинга И. Осень Средневековья. М., 2003.
108. Холл Джеймс. Словарь сюжетов и символов в искусстве. М., 1997.
109. Христианство. Энциклопедический словарь. Т.1-3. М., 1993.
110. Чегодаев А.Д. Искусство Соединенных Штатов Америки от Войны за независимость до наших дней. М., 1960.
111. Человек и мир в японской культуре. Сб.статей. М., 1985.
112. Чизхолм Д. Ранние цивилизации. М., 1995.
113. Шпенглер О. Закат Европы. Т.1-2. М., 2003.
114. Щербатской Ф.И. Избранные труды по буддизму. М., 1988.
115. Яковлев Е.Г. Искусство и мировые религии. М., 1989.
116. Япония: идеология, культура, литература. Сб., М., 1989

Пытанні для самападрыхтоўкі

1. Культура Асірыі.
2. Іслам. Культура Ірака.
3. Культура Антычнай Грэцыі эпохі элінізму.
4. Уплыў культуры Антычнага Рыма на еўрапейскую цывілізацыю.
5. Культура Еўропы эпохі Адраджэння.
6. Культура Еўропы эпохі Барока.
7. Узаемадзенне беларускай і рускай культур.
8. Савецкая культура.
9. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці сусветнай культуры ў XX–XXI стст.
10. Культура Аўстраліі.
11. Культура дакалумбавай Афрыкі.
12. Традыцыйная культура Афрыкі.

ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА КУРСАВЫХ І ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

1. Біпалярнасць свету ў міфалагічных уяўленнях (на матэрыяле аднаго з жанраў фальклору).
2. Матыў паміранння-ўваскрэсення ў старажытных містэрыях, некаторых жанрах фальклору і літаратуры (параўнальна-абагульняючы аналіз).
3. Ідэя Космаса-Храма ў славянскай міфалогіі.
4. Прынцыпы арганізацыі прасторы ў міфе, казцы, літаратурным творы (параўнальны аналіз).
5. Агонь як стыхія космасу, “агнявыя” метафары ў паэтычнай традыцыі славян.
6. Міфалагічны, сюжэтны, гістарычны час ў творчасці Х (аўтар на выбар).
7. Міфалагізаваны герой у паданнях і легендах рускага народа.
8. Міфалагічная свядомасць як аснова рускай літаратурнай казкі.
9. Міфалагізаваная жывёла (на выбар) у календары, фальклоры, выяўленчым мастацтве Беларусі (Расіі, Польшчы, Сербіі, Чэхіі, Македоніі, Славеніі, Славакіі, Балгарыі, Украіны і г.д.).
10. Міфалагізаваныя птушкі ў славянскай народнай культуры.
11. Загадка нараджэння і смерці, іх сувязь з ідэяй часу (на матэрыялах фальклору).
12. Евангельскія прытчы і руская класічная культура.
13. Евангельская сімволіка ў назвах твораў рускіх пісьменнікаў.
14. Сямейны рытуал як цэлае.
15. Вяселле як містэрыя несмяротнасці.
16. Свет прыроды ў сімвалах культуры.
17. Міфапаэтычны прынцып як модус ранняй беларускай (рускай, украінскай, польскай, балгарскай, сербскай і г.д.) культуры.
18. Навакольнае асяроддзе ў сістэме светабудовы язычніцтва.

19. Сонечны конь і сонечная птушка: параўнальна-тыпалагічны аналіз у розных міфалагічных сістэмах.
20. Псіхалагічныя аспекты ўспрымання цудоўнага ў сучасным грамадстве.
21. Містыцызм сучаснага этапа гісторыі.
22. Містэрыя цыклаў (міфалогія і каляндар).
23. Ісус Хрыстос – беларускімі вачыма.
24. Прыродныя і касмічныя аспекты праваслаўнай велікоднай містыкі (творчасць Кірылы Тураўскага і хрысціянскі абрад).
25. Міфалагічныя аспекты святкавання Новага года ў розных народаў Еўропы і Азіі.
26. Рускія “зімовыя святкі” і беларускія “каляды” – падабенства і розніца.
27. Сімвалы XX стагоддзя (камуністычныя, масонскія, фашысцкія і г.д.), іх барацьба паміж сабой і выяўленне ў публіцыстыцы і мастацкай літаратуры.
28. Навейшыя дасягненні генетыкі (біяфізікі, геафізікі, астрафізікі, біяхіміі) у люстэрку міфалогіі.
29. Містыка прасторы і сучасная геапалітыка.
30. GENIUS LOCI (на матэрыяле твораў беларускіх і славянскіх аўтараў).
31. Пейзажы дзяцінства (“малая радзіма”) і стыль пісьменніка.
32. Ландшафтны дызайн (паэтыка саду) у люстэрку стылю эпохі.
33. Міфалагема брамы ў архітэктуры і літаратуры.
34. Харыднасць як прыкмета сучаснай цывілізацыі (на матэрыяле літаратуры і кіно пачатку XX стагоддзя).
35. Светланосная палітра Прыгожага ў казках.
36. Макра- і мікрамаштабы казкі.
37. Міф як гісторыя шуканнях духу.
38. Вобразы “ідэальных жанчын” і “ідэальных мужчын” у міфалогіі і фальклоры ўсходніх славян.
39. Гендэрныя ідэалы ў люстэрку гістарычных эпох (на матэрыялах славянскага фальклору і літаратуры).
40. Геаграфічныя аб’екты (лес, балота, возера, рака, крыніца) як міфалагічныя рэаліі ў беларускай (рускай, украінскай, польскай, балгарскай, сербскай, чэшскай і г.д.) літаратуры.
41. Рытуальна значныя месцы ў беларускай літаратуры (могілкі, храм, лазня, калодзеж, хлеў, дарога, скрыжаванне і г.д.).
42. Апісанне абрада і яго функцый у літаратурным творы.
43. Найбольш распаўсюджаныя графічныя сімвалы (крыж, свастыка, круг і г.д.) у іх міфалагічным значэнні.
44. Народная казка і сучасная літаратура фэнтэзі.
45. Міфалагічна-легендарная традыцыя ў сусветнай літаратуры XX стагоддзя.
46. Матывы беларускага (рускага, славянскага) фальклору ў кантэксце “вечных вобразаў” сусветнай літаратуры.
47. Лічбавая сімволіка ў славянскай паэзіі XX стагоддзя.
48. Вывучэнне культуры шляхам канцэптуальных універсалій (ключавых слоў).

49. Пабудова культурных мадэляў шляхам лінгвістычнай семнатыкі.
50. Семантыка “пачатку” і “канца” ў публіцыстычных тэкстах.
51. Жыццё: пачатак і канец (на матэрыяле беларускіх і славянскіх перакладаў Бібліі).
52. Казкатэрапія: казка ў псіхатэрапіі як прафілактыка, трэніроўка, ілюстрацыя, мадэль, развіццё кантакту.
53. Тыпалагічныя адпаведнасці ў сюжэтыцы еўрапейскіх (славянскіх) і кітайскіх (японскіх, індыйскіх) казак.
54. Колеравая гама класічнай рускай паэзіі.
55. Архетып змеяборства (на матэрыяле замоў, казак).
56. Фальклор як крыніца рэканструкцыі старажытнай духоўнай культуры славян.
57. Сімвалічныя гарады і краіны (Ірый, Дуат, Кіцеж, Садом і Гамора, Туле, Шамбала, Эльдарада) у мастацкай літаратуры славян.
58. Ежа ў цэласнасці народнай культуры (мова – фальклор – міфалогія).
59. Этнічныя сімвалы ў культуры славян і і х выяўленне ў мове, фалькоры, літаратуры.

ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНА (ЗАЛІКА) ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ І ТЭОРЫЯ СУСВЕТНАЙ КУЛЬТУРЫ”

1. Розныя значэнні паняцця “культура”.
2. Культура і цывілізацыя: у чым розніца?
3. Асноўныя этапы (“культурныя рэвалюцыі”) у гісторыі чалавецтва.
4. Асаблівасці палеалітычнага мастацтва.
5. Курганна-мегалітычная культура эпохі неаліту.
6. Егіпет: агульная характарыстыка.
7. Рэлігійныя ўяўленні старажытных егіпцян.
8. Культура Егіпта Старажытнага царства.
9. Культура Егіпта Сярэдняга царства.
10. Культура Егіпта Новага царства: эпоха Хатшэпсут.
11. Першая ў гісторыі рэлігійная рэформа фараона Эхнатона і яе значэнне.
12. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Новага царства: грабніца Тутанхамона.
13. Культура Егіпта эпохі элінізму: Александрыйскі маяк; росквіт навукі.
14. Егіпет сярэднявечны.
15. Егіпет сучасны: ці ёсць каштоўны вопыт?
16. Культура Месапатаміі: Шумер.
17. Культура Месапатаміі: Вавілон як шэдэўр горадабудаўніцтва.
18. Культура Месапатаміі: Асірыя.
19. Значэнне культуры Старажытнай Месапатаміі.
20. Культура Ірака.
21. Культура Ірана (Арыяны): Авеста як першая з рэлігійных кніг чалавецтва.
22. Рэлігія зараастрызму і яе значэнне ў станаўленні сусветных рэлігій.

23.Культура Персіі імперскага перыяду.
24.Класічная літаратура Персіі.
25.Іран сярэднявечны і сучасны.
26.Індыя: прырода і культура.
27.Індская (Харапская) цывілізацыя.
28.Арыйская цывілізацыя Індыі. Класічныя эпасы.
29.Рэлігіі Індыі. Будызм і звязанае з ім мастацтва эпохі Ашокі.
30.Рэлігіі Індыі: індуізм.
31.Ісламскі перыяд у гісторыі Індыі: эпоха Вялікіх Маголаў.
32.Індыя каланіяльная і сучасная.
33.Архаічны Кітай: эпохі Ся, Шан, Чжоу.
34.Вялікія прарокі Кітая: Канфуцый і Лао Цзы.
35.Культура Кітая эпохі Цынь.
36.Культура Кітая эпохі Хань.
37.Культура Кітая эпохі Тан і эпохі Сун.
38.Сярэднявечны Кітай.
39.Сучасны Кітай – супердзяржава XXI стагоддзя.
40.Гістарычныя гарады Японіі.
41.Вераванні, абрады і святы Японіі.
42.Японскія віды мастацтва.
43.Міфалогія Антычнай Грэцыі: пантэон, цыклы.
44.Крыта-мікенскі перыяд у гісторыі Антычнай Грэцыі.
45.Антычная Грэцыя эпохі архаікі.
46.Антычная Грэцыя класічнай эпохі: філасофія.
47.Антычная Грэцыя класічнай эпохі: літаратура і тэатр.
48.Антычная Грэцыя класічнай эпохі: архітэктура і скульптура.
49.Грэцыя эпохі элінізму.
50.Антычны Рым у гістарычным аглядзе.
51.Значэнне культуры Антычнага Рыма ў развіцці заходняй цывілізацыі.
52.Архітэктура Антычнага Рыма.
53.Старажытная Іўдзея і станаўленне хрысціянства.
54.Святая зямля: асноўныя прыродныя і культурныя аб’екты, звязаныя з жыццём Хрыста.
55. Біблія як Кніга Кніг чалавецтва: структура; значэнне.
56.Жыццё Хрыста.
57.Культура Візантыі.
58.Культура Кіеўскай Русі.
59.Культура беларускіх княстваў эпохі Кіеўскай Русі.
60.Культура Уладзіміра-Суздальскага княства, Наўгародскага княства.
61.Эпоха Сярэднявечча: агульная характарыстыка.
62.Асноўныя архітэктурныя стылі эпохі Сярэднявечча.
63.Эпоха адраджэння: агульная характарыстыка.
64.Архітэктурны стыль “рэнесанс”.
65.Італьянскі жывапіс эпохі Адраджэння.
66.Руская культура XVII-XVIII стагоддзяў: Барока, Асвета.

67. Руская культура XIX стагоддзя: літаратура, тэатр.
68. Руская культура XIX стагоддзя: архітэктура, жывапіс, скульптура.
69. Беларуская культура XIII-XX стагоддзяў.
70. Асноўныя дасягненні заходняй культуры ў XVIII-XIX стагоддзях: архітэктура, жывапіс, скульптура, тэатр.
71. Савецкая культура.
72. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці культуры XX-XXI стагоддзяў.

З М Е С Т

Тлумачальная запіска…….3

Метады навучання……. 4

Тэматычны план дысцыпліны…….....6

Змест дысцыпліны…….7

Літаратура……. 14

Пытанні для самападрыхтоўкі…….19

Прыкладная тэматыка курсавых і дыпломных работ……19

Пытанні да экзамена (заліка) па дысцыпліне “Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры”…….....21

Вучэбнае выданне

Казакова Ірына Валер’еўна
Шамякіна Таццяна Іванаўна

Праграма дысцыпліны
“Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры”

Для філалагічнага факультэта па спецыяльнасцях
1- 21 05 01 – Беларуская філалогія
1- 21 05 02 – Руская філалогія
1- 21 05 04 – Славянская філалогія
1-21 05 06 – Рамана-германская філалогія

Складальнікі:
Казакова Ірына Валер’еўна
Шамякіна Таццяна Іванаўна